# Інтэрактыўнае падарожжа «Святое імя – хлеб»

Класная гадзіна для вучняў пачатковых класаў

**В. В. Петрачэнка,**
настаўнік пачатковых класаў першай катэгорыі
Рэчыцкай СШ Чэрыкаўскага раёна

Любоў да сваёй краіны пачынаецца з любові да роднага краю, з ведання яго гісторыі, традыцый, павагі да землякоў. Бацькі многіх вучняў, асабліва тых, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, маюць дачыненне да вырошчвання хлеба, гэтага цуда зямлі, якое з'яўляецца меркай матэрыяльных і маральных каштоўнасцяў у нашай краіне. Але, на жаль, даводзіцца назіраць нават у сельскіх дзяцей адсутнасць разумення ролі хлеба ў жыцці кожнага з нас. Таму выхаванне беражлівых адносіны да хлеба, выхаванне павагі да працы людзей, якія стаяць на шляху зерня ад парастка да лусты хлеба, становіцца ўсё больш актуальным. Больш таго, сельская школа павінна гадаваць сапраўднага гаспадара зямлі, які разумее сваю адказнасць перад родным краем, чалавека маральнага, духоўна прывязанага да малой радзімы, адухоўленага стваральніка, здольнага працягнуць справу бацькоў. Краіна, у якой з павагай будуць казаць пра хлебароба і па ўнутраным перакананні слова «Хлеб» пісаць з вялікай літары, можа смела глядзець у будучыню.

**Тэма.** Святое імя – хлеб.

**Мэта**: мяркуецца, што ў выніку работы на класнай гадзіне вучні будуць ведаць этапы вырошчвання і вытворчасці хлеба, звесткі пра яго карысць, правілы абыходжання з хлебам.

**Задачы настаўніка па развіцці і выхаванні вучняў:**

❐ садзейнічаць развіццю у дзяцей ўмення прымяняць набытыя веды пра хлеб у вядомай і зменены сітуацыях;

❐ спрыяць узбагачэнню лексічнага запасу вучняў прыказкамі, народнымі павер'ямі, развіццю пазнавальнага інтарэсу і творчых здольнасцяў вучняў;

❐ стварыць умовы для фарміравання ў вучняў беражлівых адносін да хлеба, выхавання паважлівых адносін да працы людзей і яе вынікаў.

**Дыдактычнае забеспячэнне класнай гадзіны:** стол, накрыты льняным абрусам, на ім хлебныя вырабы, каравай; жытнёвы і пшанічны снапы; выстава збожжавых культур; маскі для інсцэніроўкі, карткі прыказак, малюнак Жыценя, малюнкі вучняў пра хлеб, выказванні пра хлеб.

## Ход класнай гадзіны

### I. Арганізацыйны момант

– Добры дзень! Падыдзіце ўсе да мяне. Я рада бачыць вас на нашай

класнай гадзіне. А пачнем мы яе з гульні «Прывітанне». Станьце ў круг і выконвайце тое, аб чым я буду казаць:

- ✓ скажам «Добры дзень» рукамі *(вітаюцца за руку);*
- ✓ скажам «Добры дзень» вачыма *(усміхаюцца адзін аднаму);*
- ✓ скажам «Добры дзень» нагой *(вітаюцца нагамі);*
- ✓ скажам «Добры дзень» спіной *(вітаюцца спінамі);*
- ✓ скажам «Добры дзень» словамі *(звяртаюцца з добрымі словамі адзін да аднаго);*
- ✓ скажам «Добры дзень» плячом *(вітаюцца плячыма);*
- ✓ станем радасна кругом *(становяцца ў круг і абдымаюцца)*!

### II. Уводна-матывацыйны этап

***1) Выхад на тэму класнай гадзіны праз стварэнне праблемнай сітуацыі***

- ✓ Дзеці, паглядзіце, калі ласка, на стол, што вы бачыце?
- ✓ Паглядзіце на талерку з недаедзенымі кавалкамі хлеба, крошкамі, пакінутымі вучнямі пасля абеду. Што скажаце? Якая праблема яскрава ўзнікае, калі бачыш гэта ўсё?
- ✓ Як вы думаеце, аб чым пойдзе размова на класнай гадзіне?

*Вучні выказваюць свае меркаванні. Класны кіраўнік знаёміць вучняў з тэмай класнай гадзіны.*

***2) Мэтавызначэнне***

– Паспрабуйце вызначыць задачы, якія мы паставім перад сабой, абапіраючыся на словы-падказкі: даведаемся, навучымся.

*Класны кіраўнік знаёміць вучняў з мэтай і задачамі.*

**III. Аперацыйна-пазнавальны этап**

***1) Уступнае слова настаўніка***

– Сёння мы будзем гаварыць пра хлеб, пра яго шлях на стол чалавека,

пра людзей, якія яго вырошчваюць. Дакажам, што хлеб трэба берагчы. Што ён з'яўляецца сімвалам жыцця, здароўя, працы, дабрабыту і багацця. Нашым спадарожнікам сёння стане Жыцень. Знаёмцеся!

***2) Выступленне загадзя падрыхтаванага вучня ў вобразе Жыценя***



**Жыцень –** гэта гаспадар поля. Расхаджвае ён па палях і агародах, аглядвае, ці ўсё добра прыбрана. Калі Жыцень знойдзе на жніўніку шмат каласоў, пакінутых жнеямі, збірае іх і, звязаўшы ў адзін сноп, пераносіць на іншы жніўнік, дзе сабрана ўсё чыста, з ашчаднасцю. У выніку такой працы Жыценя у наступным годзе на тым месцы, дзе Жыцень знайшоў шмат пакінутых каласоў, здараецца неўраджай і, наадварот, вялікі ўраджай збярэ гаспадар на той ніве, дзе пакінуў ён сноп. Тое ж бывае і з агародамі, якія наведвае Жыцень і на якіх знаходзіць нядбайнасць, гаспадарскія непарадкі.

Убачыўшы гаспадара агарода, ён грозіць яму пальцам. Гэта значыць, што на гэтым агародзе трэба чакаць неўраджаю. У Беларусі існуе павер'е аб тым, што калі Жыцень з'яўляецца часам ў выглядзе жабрака з суровым тварам, то чакай усеагульнага голаду ці вялікага неўраджаю на наступны год. *(Вучань у вобразе Жыценя звяртаецца да вучняў.)* Дарагія сябры! Я дбайны гаспадар Жыцень. Запрашаю вас ў падарожжа па дарозе хлеба.

***3) Выступленне вучняў аб значэнні хлеба ў жыцці чалавека***

**Вучань 1.** Хлеб – сімвал працы і жыцця. Штодня кожны з нас бярэ ў рукі некалькі разоў хлеб і з задавальненнем есць яго, колькі захоча. Мы прывыклі да хлеба, як прывыклі да паветра, часам не заўважаем яго, не думаем пра яго, ды і каштуе ён мала. І нават не ўяўляем сабе, як можа быць інакш.

**Вучань 2.** На працягу многіх стагоддзяў асноўным прадуктам харчавання ў беларусаў быў жытні хлеб. Ім пачынаўся і заканчваўся сняданак, абед і вячэра. Ён суправаджаў селяніна ў полі. З хлебам і соллю сустракалі і праводзілі дарагіх гасцей, з ім ішлі ў сваты, гулялі вяселле, хрэсьбіны. Ва ўсіх выпадках хлеб служыў залогам шчасця і дабрабыту. «Хлеб у доме –гаспадар, на працы – сябар, у дарозе – таварыш», – казалі пра яго беларусы. Гэтым нашы продкі падкрэслівалі значнасць хлеба ў жыцці чалавека.

**Вучань 3.** За многія стагоддзі выпрацавалася пэўнае стаўленне да хлеба. З ім звязаны шэраг народных прыкмет і павер'яў. Лічылася вялікім грахом кінуць на падлогу крошку хлеба. Калі ж выпадкова здаралася, што падаў кавалак хлеба, то яго падымалі і цалавалі, перад тым як пакласці ў рот. Крышыць хлеб таксама забаранялася: хто так зробіць, той ніколі не будзе мець хлеба. Па хлебу прадказвалі нават лёс членаў сям'і.

**Вучань 1.** Мы сустракаемся з хлебам кожны дзень. Без яго не абыходзіцца ні скаромны сняданак, ні будні абед, ні свята. Але ніхто з нас не задумваецца аб тым, што з'яўляецца ён на нашым стале дзякуючы нялёгкай працы людзей аж 120 прафесій!

***4) Інсцэніроўка казкі «Воўк-гультай»***

Пакаштаваў аднаго разу воўк хлеба. Смачна. І пытаецца:

– Скажы мне, чалавеча, як яго робяць?

– Спачатку трэба глебу ўзараць. Пасля пабаранаваць.

– І тады есці?

– Не. Трэба пасеяць, зжаць, памалаціць, змалоць… Потым спячы. А тады ўжо есці.

– Што смачна, то смачна, – сказаў воўк. – Але ж колькі працы! Жыў я без хлеба дагэтуль і далей буду жыць.

Так і жыве воўк без хлеба.

**Жыцень.** Чаму воўк жыве без хлеба? *(Адказы вучняў.)* Рос спачатку ён на волі ў полі, летам цвіў і каласіўся, а калі абмалаціўся, ён у зерне пераўтварыўся, з зерня ў муку і цеста… Вырас ён пад сінім небам і прыйшоў на стол ён … *(хлебам)*. А вы, дзеткі, ці ведаеце, які шлях прайшоў хлеб, перш чым трапіць на стол? *(Адказы вучняў.)*

***5) Работа ў парах***

**Заданне «Ад зерня да каравая».** Размясціце правільна карткі, на якіх запісаны этапы працэсу вырошчвання хлеба.

- ✓ З зерня робяць муку.
- ✓ Угнойваюць зямлю.
- ✓ Барануюць зямлю.
- ✓ Засцерагаюць збожжа ад шкоднікаў.
- ✓ Узорваюць зямлю.
- ✓ Гатовы хлеб адвозяць у магазіны.
- ✓ Спелую збажыну жнуць камбайны.
- ✓ З мукі выпякаюць хлеб.
- ✓ Сеюць зерне.
- ✓ Абмалочанае зерне вязуць у зернесховішча.

*Калектыўная праверка вынікаў работы ў пары.*

**Жыцень.** Назавіце прафесіі людзей, якія маюць дачыненне да шляху хлеба з нівы да нашага стала. *(Трактарысты, камбайнеры, аграномы, аграхімікі, млынары, пекар, прадавец і г.д.)* Малайцы, дзеці, я вамі задаволены. Прадаўжаем наша падарожжа.  А што вы, рабяткі, ведаеце пра хлеб?

***6) Прыпынак «Што я ведаю пра хлеб?».***

*Загадзя падрыхтаваныя вучні ў вобразе аграномаў і медыкаў выходзяць і паведамляюць інфармацыю пра хлеб.*

**Аграномы.** А ці ведаеце вы, што такое злакі? Злак –  гэта расліна ў выглядзе саломіны, якая заканчваецца каласком ці мяцёлкай. Да гэтага сямейства адносяцца  пшаніца, жыта, ячмень, проса, авёс, кукуруза  і рыс. *(Аграномы  дэманструюць пучкі зерня злакавых культур пшаніцы, жыта, аўса, ячменю, проса, мяцелкі кукурузы.)*

**Дактары.** Хлеб дае нашаму арганізму бялкі і вугляводы, забяспечвае яго магніем, фосфарам, каліем, што неабходна  для работы мозга. У хлебе шмат вітамінаў. Амаль палову сваёй энергіі чалавек бярэ з хлеба. Вучоныя лічаць, што дарослы чалавек  з’ядае ў суткі  300–500 г хлеба, пры цяжкай працы – ўсе 700 г. Дзецям і  падлеткам трэба 150–400 г хлеба.

**Жыцень.** Цудоўна, я задаволены вашай кемлівасцю. А ці ведаеце вы старажытныя народныя павер’і?

***7) Прыпынак «Народныя павер’і»***

*Вучні расказваюць павер’і, падрыхтаваныя да класнай гадзіны.*

- ✓ Самым вялікім грахом лічылася  упусціць акрайчык хлеба на зямлю ці
- ✓ на падлогу, а яшчэ большым  – растаптаць гэты кавалачак нагамі.
- ✓ Людзі, разламаўшыя хлеб папалам, становяцца сябрамі на ўсё жыццё.
- ✓ Не  дазвалялася, каб адзін чалавек  даядаў хлеб за другім: забіраў яго
- ✓ шчасце і долю.

- ✓ Нельга есці за спіною другога чалавека: з’ядаеш яго сілу.
- ✓ Калі дасі хлеб у час абеду сабакам, пасягне цябе бедната.
- ✓ Калі выпадкова хлеб выпаў з рук, дарагі госць спяшаецца да вас.

**Жыцень.** І гэта вы ведаеце. Малайчыны! Стаміўся я крыху, давайце адпачнём.

***8) Фізкультхвілінка***

- ✓ Хлеб мы сеем, сеем, сеем, *( хадзьба на месцы з махамі рукамі ( сеем))*
- ✓ А ён рунню зелянее, *(шырока разводзяць рукі ўбакі)*
- ✓ Спіць пад снегам, *(прысесці, рукі пад галаву)*
- ✓ Узрастае, *(пацягнуцца)*
- ✓ Цягнецца да сонца, *(стаць на дыбачкі)*
- ✓ Сокам наліваецца, *(гладзяць шчочкі)*
- ✓ І на стол спяшаецца *(бег на месцы)*.

***9) Гульня «Збяры прыказкі»***

**Жыцень.** Адпачылі крыху, прадоўжым далей наша падарожжа. Нёс я, дзеткі, для вас прыказкі, зачапіўся за пянёк, яны і пераблыталіся. Дапамажыце іх правільна сабраць.

*Дзеці з частачак збіраюць прыказкі, зачытваюць і тлумачаць іх сэнс.*

- ✓ Хто араць не лянуецца,… (у таго хлеб гадуецца).
- ✓ Не лянуйся з плужком – …(будзеш з піражком).
- ✓ Вада – маці, …( а хлеб – бацька).
- ✓ Хлеб у рот –…( розум у галаву).
- ✓ Хлеб ды вада – …(асілкаў яда).
- ✓ Да зямлі прыгніся ніжэй – … ( будзеш да хлеба бліжэй).
- ✓ Не чакай з неба … ( дармавога хлеба).
- ✓ Што за яда,…( калі хлеба няма).

***10) Прыпынак «Паэтычны»***

**Вучань.** Дарагі наш Жыцень, адпачні крыху і паслухай павучальную гісторыю пра хлеб. А мы адкажам, чаму нас вучыць прытча.

**Максім Танк «Прытча пра хлеб»** *(чытае падрыхтаваны вучань)*.

Аднойчы на кірмаш здалёк
Вандроўнік плёўся ў горад
І наракаў на свой мяшок,
Набіты лустай спорай.

Аж Хлеб не вытрымаў і так
Азваўся: – Што бядуеш?
Зусім не ты мяне, дзівак,
Але цябе нясу я.

– Ну што ж, пабачым, хто – каго! –
Той запярэчыў строга
І з цяжкага мяшка свайго
Хлеб вытрас на дарогу.

І сам пашкандыбаў далей.
Нішто не муліць плечы.
Дзень прамінуў. Ужо ў імгле
Стаў набліжацца вечар.

Настаў і час перакусіць.
Успомніў хлеб вандроўнік,
Што недзе, кінуты, ляжыць,
Духмяны і цудоўны!

Прылёг на нейкім дзірване,
Каб адпачыць хоць трошкі.
Але галоднаму і ў сне,
Знаць, сняцца хлеба крошкі.

Цяпер і сам сабе не рад.
Не спіцца, не ляжыцца.
Ці не вярнуцца лепш назад
Ды з другам памірыцца?

Устаў Вандроўнік і брыдзе –
Ідзе пад зорным небам,
На месца памятнае, дзе
Ён пасварыўся з Хлебам.

О, як ён рад быў зноў, калі
Сваю пабачыў страту!
І Хлебу нізкі, да зямлі,
Аддаў паклон, як брату.

***11) Прыпынак «Бабуліны парады»***

**Жыцень.** Што праўда, то праўда: хлеб – усяму галава. Ва ўсіх у вас, дзеці, ёсць бабулі. А што яны вам расказвалі пра хлеб? Яны такія старэнькія, як і я, і ўсё на свеце ведаюць.

**Вучань 1.** Мая бабуля казала, што хлеб даўжэй захоўвае сваю свежасць, калі ў посуд, дзе ён ляжыць, пакласці яблык, кавалачак сырой ababранай ад лушпіння бульбіны ці крыху солі.

**Вучань 2.** Мая бабуля казала, што хлеб даўжэй застаецца мяккім, калі яго завярнуць у чыстую паперу ці тканіну.

**Вучань 3.** Мая бабуля казала, што чэрствы хлеб можна змякчыць, калі яго пакрапіць вадой, пакласці ў посуд з накрыўкай і паставіць на 10 хвілін у печ ці ў духоўку.

**Вучань 4.** Мая бабуля казала, што трэба захоўваць асобна ржаны хлеб ад пшанічнага, каб не згубіўся смак і пах белага хлеба.

**IV. Падвядзенне вынікаў**

***1) Гульня «Праўда – хлусня»***

**Жыцень.** Стаміўся я, але вельмі вамі застаўся задаволены. Пагуляем з вамі ў гульню « Праўда – хлусня».

- ✓ Хлеб расце на градзе?
- ✓ Пекар працуе на камбайне?
- ✓ Для вырошчванне хлеба сонейка патрэбна?
- ✓ На млыне працуе млынар?

- ✓ Хлеб дае сілу?
- ✓ Ці можна выкідваць хлеб?

Малайцы, рабяты! Кожны дзень, узяўшы ў рукі кавалачак хлеба, успомніце добрым словам усіх, хто яго ствараў, падумайце пра тое, якім вялікім багаццем вы валодаеце і як яго трэба берагчы.

***2) Прыём «Словы хлебу»***

**Жыцень.** Паглядзіце, калі ласка, на кавалкі хлеба на талерцы. Што вы будзеце рабіць з недаедзеным хлебам пасля таго, як даведаліся аб значэнні хлеба? Як трэба адносіцца да хлеба і тых, хто суправаджае хлеб на яго доўгім шляху ад нівы да нашага стала? Звярніцеся да кавалачкаў хлеба са словамі павагі

*Дзеці звяртаюцца да кавалкаў хлеба, пакінутых пасля абеду:*

- ✓ Прабач, хлебушак, я буду цябе берагчы…
- ✓ Я ў час абеду буду браць такі кавалачак, які з’ем…
- ✓ Я буду вучыць малодшых вучняў берагчы хлеб…

**V. Рэфлексія**

- ✓ Што цікавага вы даведаліся сёння, што спадабалася, запомнілася?
- ✓ Якія высновы вы зрабілі для сябе?

**Жыцень.** Да пабачэння, дарагія сябры! Я вяртаюся ў поле ўпэўнены, што вы будзеце беражліва адносіцца да хлеба і будзеце з павагай адносіцца да тых людзей, якія стварылі гэты цуд!

## Літаратура

1. **Баранова, Л. И.** Внеклассные занятия по воспитанию нравственной культуры младших школьников / Л. И. Баранова. – Мозырь: Содействие, 2011. – 200 с.

2. **Сержпутоўскі, А. К.** Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

3. **Старовойтова, Т. А.** От зёрнышка до каравая / Т. А. Старовойтова. – Мозырь: Содействие, 2013.